доступа: <http://mfa.gov.by/press/news_mfa/c0c4de204fe94ae7.html>. – Дата доступа: 18.09.2020.
18. Макей назвал «очень опасным прецедентом» резолюцию СПЧ ООН по ситуации в Беларуси [Электронный ресурс] // БЕЛТА. – 18.09.2020. – Режим доступа: <https://www.belta.by/politics/view/makej-nazval-ochen-opasnym-pretsedentom-rezoljutsiju-spch-oon-po-situatsii-v-belarusi-407373-2020/>. – Дата доступа: 18.09.2020

# ШЛЯХ ААН ДА ФАРМІРАВАННЯ КАНЦЭПЦЫІ ІНФАРМАЦЫЙНАГА ГРАМАДСТВА Ў 1940-Я – 1970-Я ГГ.

*Л.А. Фядотаў*
*Белінтэрсат, 24/1, вул. Вайсковая, в. Станькава,*
*Дзяржынскі раён, Мінская обл., 222731, Беларусь, fedotov.l@belintersat.com*

В статье освещается история формирования в ООН в 1940-х – 1970-х гг. подходов в отношении развития и регулирования международного многостороннего сотрудничества в области информации, коммуникации и связи. На основе анализа содержания решений, в первую очередь резолюций Генеральной Ассамблеи, выделены три этапа. Временные рамки исследования охватывают процессы и события до начала рассмотрения в ООН концепции нового международного порядка в области информации и связи.

***Ключевые слова:*** Организация Объединенных Наций; Генеральная Ассамблея; международное сотрудничества в области информации и связи; информационное общество.

# THE BEGINNING OF THE UN WAY TOWARDS THE INFORMATION SOCIETY CONCEPTION IN 1940S –1970S

*L.A. Fedotov*
*Belintersat, st. Vaiskovaya, 24/1, 222731, v. Stankovo,*
*Dzerzhinsk District, Minsk region, Belarus, fedotov.l@belintersat.com*

The article highlights the history of forming of UNO approaches towards the development and reglamentation of its multilateral international cooperation in the shere of information and communication in 1940s – 1970s. Three stages in the UN activities have been distinguished on the basis of content analysis of the adopted resolutions, mainly the General Assembly resolutions. The processes and events covered by the research are within the period before the conception of the new international information and communication order was put to the UN agenda

***Keywords:*** The United Nations; General Assembly; Information Society; International Cooperation in the Information and Communications Technology Sphere

Распрацоўка ў рамках ААН на мяжы XX і XXI стагоддзяў канцэпцыі арыентаванага на інтарэсы людзей, адкрытага для ўсіх і

накіраванага на развіццё інфармацыйнага грамадства была б немагчымай без папярэдняй дзейнасці гэтай універсальнай міжнароднай установы па арганізацыі міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне інфармацыіі і сувязі. А пачалася яна з першага ж года існавання ААН. На першай сесіі Генеральнай Асамблеі было абмеркавана пытанне аб скліканні міжнароднай канферэнцыі прэсы [1, p. 95], а ўлетку 1946 г. у структуры Камісіі па правах чалавека ўтворана Падкамісія па свабодзе інфармацыі і прэсы (дзейнічала да 1952 г.) [2, p. 402].

На шляху ААН да канцэпцыі інфармацыйнага грамадства ў 1940 – 1970-я гг. лічым мэтазгодным вызначыць тры этапы.

*Першы этап* (1940-я – сярэдзіна 1950-х гг.) адлюстроўвае панаванне ў палітычнай барацьбе ў ААН накірунку «Усход – Захад» (краіны сацыялізму – астатні свет). Для яго адметна засяроджванне намаганняў дзяржаў-удзельніц ААН вакол вызначэння і распрацоўкі прававых інструментаў правядзення ў жыццё канцэпцыі свабоды інфармацыі. Пры гэтым краіны заходняга блоку бачылі ў свабодзе інфармацыі, у першую чаргу, свабоду ад умяшання дзяржавы ў працэсы пошуку, атрымання і распаўсюджвання інфармацыі. Краіны савецкага блоку ў ААН (па стане на пачатак 1948 г. да яго належылі СССР, БССР, УССР, Польшча, Чэхаславакія, Югаславія), наадварот, адстойвалі вырашальную ролю дзяржавы ў названых працэсах, бо менавіта дзяржава павінна была гарантаваць, што масавая інфармацыя па сваім змесце накіравана на умацаванне міжнароднага міру, бяспекі, узаемаразумення паміж дзяржавамі, супраць распаўсюджвання ідэй фашызму і прапаганды вайны. Можна сцвярджаць, што ў палітычнай барацьбе вакол канцэпцыі свабоды інфармацыі кожны з дзвюх блокаў зыходзіў са сваіх агульных прыярытэтаў знешнепалітычнай прапаганды: распаўсюджванне каштоўнасцей заходняга «свабоднага свету» і барацьба СССР на чале «прагрэсіўнага чалавецтва» за мір.

У разглядаемы перыяд краіны заходняга блоку колькасна пераважалі ў органах ААН, таму падрыхтаваныя праекты дакументаў грунтаваліся пераважна на іх падыходах да свабоды інфармацыі. Такой была рэдакцыя артыкула праекта Усеагульнай дэкларацыі правоў чалавека, што датычыў свабоды шукаць, атрымліваць і распаўсюджваць інфармацыю, якая была распрацавана ў студзені 1948 г. на пасяджэнні падкамісіі па свабодзе інфармацыі і прэсы Камісіі па правах чалавека і ў амаль нязменным выглядзе ўвайшла у канчатковы тэкст дэкларацыі [3, p. 4]. Але пакуль палітычная барацьба паміж заходнім і савецкім блокамі не набыла рысы непрымірымага ідэалагічнага супрацьстаяння спробы дасягнуць кампрамісу паміж абодвума падыходамі да свабоды інфармацыі прадпрымаліся.

Прыкладам такога кампрамісу з’яўляліся праекты міжнародных канвенцый, распрацаваных на Канферэнцыі ААН па свабодзе інфармацыі ў сакавіку – красавіку 1948 г.: аб свабодзе інфармацыі; аб збіранні і міжнароднай перадачы навін; аб праве дзяржавы на абвяржэнне. У гэтых праектах былі прадугледжаны выпадкі, пры якіх умяшанне дзяржавы ў працэсы атрымання і распаўсюджвання інфармацыі прызнавалася мэтазгодным [4, p. 7–19]. Але кампрамісны характар праектаў названых міжнародных дагавораў усё роўна не дазволіў адкрыць іх для падпісання ў сувязі з узмацненнем кафрантацыйнасці ва ўзаемадзеянні заходняга і савецкага блокаў у ААН. Безвынікова завяршылася і спроба зацвердзіць асноватворныя прынцыпы забеспячэння свабоды інфармацыі ў выглядзе дакумента рэкамендацыйнага характару – дэкларацыі. Пытанне аб падпісанні міжнароднай канвенцыі аб свабодзе інфармацыі і прыняцці дэкларацыі аб свабодзе інфармацыі заставалася на парадку дня Генеральнай Асамблеі ААН да 1970 г. Ад гэтага часу ААН да яго разгляду не вярталася.

У першай палове 1950-х гг. краіны заходняга блоку спрабавалі дамагчыся ў ААН асуджэння практыкі глушэння сігналаў замежных радыёстанцый. У снежні 1950 г. на пятай сесіі Генеральнай Асамблеі была прынята рэзалюцыя «Свабода інфармацыі: парашкоды радыёперадачам», у якой наўмыснае стварэнне перашкод у прыманні насельніцтвам радыёсігналаў, што перадаваліся з-за мяжы, прызнавалася парушэннем прынцыпаў свабоды інфармацыі [5, p. 44]. На дзевятай сесіі Генеральнай Асамблеі ў 1954 г. ініцыявалася юрыдычна абмежаваць адпаведную практыку праз падпісанне дадатковага пратаколу да Міжнароднай канвенцыі аб выкарыстанні вяшчання на карысць міру, падпісанай у рамках Лігі Нацый у 1936 г. і набыўшай моц у 1938 г., але фактычна мёртвай у якасці інструменту рэгулявання міждзяржаўных адносін. Пісьмовае апытанне 26 дзяржаў-удзельніц канвенцыі аб іх гатоўнасці далучыцца да дадатковага пратакола, праведзенае Генеральным сакратаром ААН, дало да 1956 г. толькі тры станоўчыя адказы [6, p. 10]. Такі вынік прадвызначыў спыненне на наступныя 10 гадоў далейшых намаганняў па выпрацоўцы адзінага сусветнага падыходу да праблемы распаўсюджвання кантэнту СМІ праз дзяржаўныя межы.

Яшчэ у час правядзення першай сесіі Камісіі па правах чалавека пры абмеркаванні задач і мэтаў стварэння Падкамісіі па свабодзе інфармацыі і прэсы прадстаўнікамі некаторых краін, напрыклад Індыі, звярталася ўвага на розную ступень развіцця СМІ ў краінах свету [2, p. 233]. У 1952 г. на сёмай сесіі Генеральнай Асамблеі ААН была

ўпершыню прынята рэзалюцыя, прысвечаная аказанню дапамогі слабаразвітым краінам у развіцці нацыянальных СМІ, пераважна праз павышэнне кваліфікацыі іх работнікаў [7, p. 24–25]. Праблема неразвітасці нацыянальных СМІ ў гэты час разглядалася ў ААН яшчэ ў якасці другаснай у дачыненні да задач забеспячэння свабоды інфармацыі.

Уздым у ААН барацьбы супраць каланіялізму і неакаланіялізму, што пачаўся з сярэдзіны 1950-х гг., станаўленне Руху Недалучэння садзейнічалі змяненню прыярытэтаў у дзейнасці арганізацыі па развіццю міжнароднага супрацоўніцтва ў інфармацыйнай галіне. Для *другога этапу* шляху ААН да канцэпцыі інфармацыйнага грамадства *(*сярэдзіна 1950-х – пачатак 1970-х гг.*)* уласцівае наданне першаснага значэння пытанням дапамогі развівальным краінам СМІ ў стварэнні паўнавартасных нацыянальных сістэм СМІ, прадухілення распаўсюджвання праз СМІ некаторых відаў дэструктыўнай інфармацыі (такіх, як прапаганда апартэіду, расізму, нацызму, каланіялізму і расавай дыскрымінацыі), а таксама пачатак непасрэднага звароту да магчымасцей інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій (ІКТ) у забеспячэнні працэсу развіцця. Краіны заходняга блоку паступова страчвалі ініцыятыву ў вызначэнні падыходаў ААН па пытаннях інфармацыі і сродкаў яе распаўсюджвання.

Пры гэтым мэтазгодна адзначыць Міжнародную канвенцыю аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі 1965 г., Міжнародную канвенцыю аб выкараненні злачынстваў апартэіду і пакаранні за яго 1973 г., Дэкларацыю ААН аб ліквідацыі ўсіх форм расавай дыскрымінацыі 1963 г., рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі ААН, прынятыя у 1958 г. на яе трынаццатай сесіі (№1313) і ў 1968 г. – на дваццаць трэцяй сесіі (№ 2448).

З 1959 г. са стварэннем у ААН Камітэта па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах у поле зроку міжнароднай універсальнай арганізацыі трапілі пытанні ўсталявання прынцыпаў ажыццяўлення сувязі праз штучныя спадарожнікі. У частцы D рэзалюцыі Генеральнай Асамблеі 1721, прынятай на шаснаццатай сесіі ў 1961 г., быў абвешчаны прынцып недыскрымінацыі доступу дзяржаў да спадарожнікавай сувязі, прадугледжана выкарыстанне існуючых інструментаў тэхнічнай дапамогі для развіцця нацыянальных сістэм сувязі з прымяненнем касмічнай сувязі [8, p. 7].

У канцы 1960-х гг. у ААН пачалася дыскусія вакол правамернасці непасрэднага прыёму праграм СМІ са спутнікаў з пункту гледжання дзяржаўнага суверэнітэту. Як і ў час ранейшага разгляду пытанняў міжнароднага радыёвяшчання, абаронцамі недатыкальнасці дзяржаўнага

суверэнітэту у гэтай сферы камунікацыі былі сацыялістычныя краіны. У 1972 г. СССР прапанаваў унесці ў парадак дня дваццаць сёмай сесіі Генеральнай Асамблеі пытанне аб падрыхтоўцы міжнароднай канвенцыі аб галоўных прынцыпах выкарыстання дзяржавамі штучных спадарожнікаў для непасрэднага вяшчання тэлепраграм і прадставіў сваю рэдакцыю яе праекта [9, p. 5–7]. Нягледзячы на відавочную непрымальнасць некаторых палажэнняў праекта канвенцыі для краін заходняга блоку, сама ідэя распрацоўкі галоўных прынцыпаў была падтрымана Генеральнай Асамблеяй, якая рэкамендавала распачаць працу ў Камітэце па выкарыстанні касмічнай прасторы ў мірных мэтах. На наступных сесіях Генеральнай Асамблеі Камітэт даводзіў да ведама інфармацыю аб прамежкавых выніках працы, але праект дакумента так і не быў прыняты. Спыненне ў 1981 г. работы над праектам прынцыпаў верагодна звязана з падрыхтоўкай у заходніх краінах першых камерцыйных праектаў спадарожнікавага тэлевяшчання.

У канцы 1960-х гг. ААН звярнула ўвагу і на магчымасці выкарыстання вылічальнай тэхнікі ў мэтах развіцця. На наш погляд, з рашэнняў ААН найбольш вартая ўвагі рэзалюцыя Генеральнай Асамблеі 2804 ад 14 снежня 1971 г., у якой змяшчалася рэкамендацыя аб распрацоўцы нацыянальных палітык датычна прымянення вылічальнай тэхнікі [10, p 55]. Можна лічыць яе першай папярэдніцай палажэнняў Жэнеўскага плана дзеянняў 2003 г. Сусветнай сустрэчы на вышэйшым узроўні па пытаннях інфармацыйнага грамадства аб неабходнасці складання нацыянальных электронных стратэгій.

На *трэцім этапе* шляху ААН да канцэпцыі інфармацыйнага грамадства (ад сярэдзіны 1970-х гг.) развіццё нацыянальных сістэм масавай інфармацыі і сувязі стала разглядацца ў якасці важнага фактару ўсталявання новага міжнароднага эканамічнага парадку. Сведчаннем гэтай тэндэнцыі было прыняцце Генеральнай Асамблеяй ў 1976 г. рэзалюцыі 31/139 «Супрацоўніцтва ў прымяненні і паляпшэнні нацыянальных сродкаў масавай інфармацыі і сувязі ў мэтах сацыяльнага прагрэсу і развіцця» [11, p. 113–114]. Пачынаючы з 1978 г. задачы садзейнічання міжнароднаму супрацоўніцтву ў галіне масавай інфармацыі разглядаліся ў ААН у кантэксце ўсталявання новага міжнароднага парадку ў галіне інфармацыі і сувязі. Гэта канцэпцыя склалася у асноўным па-за рамкамі ААН: вырашальная роля ў яе станаўленні належыла Руху Недалучэння, ЮНЕСКА і шэрагу міжнародных неўрадавых арганізацый, якія выступалі за дэмакратызацыю міжнароднага інфармацыйнага парадку. Але рашэнні, прынятыя ў ААН у папярэднія гады, фактычна падвялі гэту

міжнародную ўніверсальную арганізацыю да актыўнага ўдзелу ў абмеркаванні дадзенай канцэпцыі.

Якія крокі ААН на шляху да канцэпцыі інфармацыйнага грамадства, зробленыя ў 1940-я – 1970-я гг., захоўваюць значэнне ў наш час? Да іх варта аднесці палажэнні праектаў трох міжнародных канвенцый, распрацаваных на Канферэнцыі ААН па свабодзе інфармацыі 1948 г. Агульныя прынцыпы, якія былі пакладзены ў аснову дадзеных праектаў, могуць быць улічаны пры распрацоўцы міжнародных дагавораў па пытаннях інфармацыйнай бяспекі. У разглядаемы перыяд у ААН узяў пачатак сістэмны падыход, які прадугледжвае развіццё нацыянальных сістэм інфармацыі і сувязі, а таксама іх узаемадзеянне ў якасці складовай часткі працэсу ўстойлівага развіцця.

БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ СПАСЫЛКІ

1. Resolutions Adopted by the United Nations General Assembly During the Second Part of Its First Session From 23 October to 15 September 1946 [Electronic resource] // United Nations. – Mode of Access: <https://www.un.org/ga/search/view_doc.asp?symbol=a/64/Add.1>. – Date of Access: 20.09.2020.

2. United Nations Economic and Social Council Official Records First Year Second Session. – New York, 1946. – 406 p.

3. United Nations Economic and Social Council. Commission on Human Rights. Sub-Commission on Freedom of Information and of the Press. Second Session. Summary Record of the Fifth Session 21 January 1948. – New York, 1948. – 7 p.

4. United Nations Conference on Freedom of Information Held at Geneva, Switzerland, from 23 March to 21 April 1948. Final Act [Electronic resource] // Digital Library of the UN. – Mode of Access: <https://digitallibrary.un.org/record/3806839>. – Date of Access: 20.09.2020.

5. Resolutions Adopted by the United Nations General Assembly during the period 19 September to 15 December 1950. – New York, 1951. – 80 p.

6. United Nations Economic and Social Council. Commission on Human Rights Thirteenth session. Freedom of Information. Note by the Secretary General E/CN. 4/732 of 7 December 1956. – New York, 1956. – 19 p.

7. United Nations Resolutions Adopted by the General Assembly at Its Seventh Session during the period from 14 October to 21 December 1952 // General Assembly Official Records: Seventh Session. Supplement No. 20 (A/2361). – New York, 1953. – 72 p.

8. United Nations Resolutions Adopted by the General Assembly at Its Sixteenth Session 19 September 1961 – 23 February 1962: General Assembly Official Records: Sixteenth Session. Supplement N 17 (A/5100). V. I. – New York, 1962. – 72 p.

9. United Nations General Assembly. Twenty-seventh session. Preparation of an International Convention on Principles Governing the Use by States of Artificial Earth Satellites for Direct Television Broadcasting. Letter dated 8 August 1972 from the Minister for Foreign Affairs of the Union of the Soviet Socialist Republics addressed to the Secretary-General. New York, 1972. – 9 p.

10. United Nations Resolutions Adopted by the General Assembly during Its Twenty-Sixth Session 21 September 1971 – 22 December 1971 // General Assembly Official Records: Twenty-Sixth Session. Supplement No. 29 (A/8429). – United Nation [Electronic resource]. – Mode of access: <https://www.un.org/ga/search/view_doc.asp?symbol=A/8429(supp)>. – Date of Access: 20.09.2020.

11. United Nations Resolutions Adopted by the General Assembly at Its Thirty-First Session 21 September – 22 December 1976: General Assembly Official Records: Thirty-First Session. Supplement N 39 (A/31/39). Vol. I. – New York, 1977. – 226 p.